# Літаратуразнаўства

В.Ю. БАРОУКА

## МАСТАЦКІ ЭТНАГРАФІЗМ ЯК СТЫЛЕЎТВАРАЛЬНЫ ФАКТАР У БЕЛАРУСКАЙ ПРОЗЕ XX ст.

Исследуется художественный этнографизм как стилеобразующий фактор в белорусской прозе XX века. Утверждается, что художественный этнографизм как элемент структуры произведения тогда выполняет стилеобразующую функцию, когда он системно повторяется в произведениях писателя и подчеркивает индивидуально-авторское видение мира.

The art ethnographism as the style-formation factor in the Belarusian prose of the XX century is being researched. The author affirms, that the art ethnographism as an element of the literary work fulfils the style-formation function only in the situation of the system repetition in the literary works of the author and it emphasizes the authorial vision of the world.

Мастацкі этнаграфізм - канцэптуальнае асэнсаванне і адлюстраванне ў літаратуры матэрыяльнай і духоўнай культуры народа - пры пэўных умовах можа станавіцца стылеўтваральным фактарам.

Прыхільнік так званага гульнявога паходжання культуры Й. Хейзінга пісаў: «Ці не змяшчаецца ў паняцці стыль прызнанне ўключанасці туды пэўнага элемента гульні? Ці не ўласціва самому нараджэнню стылю нейкая гульня духу ці ўласцівая нам здольнасць утвараць формы? Стыль жыве тым жд, што і гульня: рытмам, гармоніяй, чаргаваннем, паўторамі, рэфрэнам і метрам» (Хейзинга 1992, 60). Стыль - гэта сістэма мастацкіх сродкаў, дамінанта мастацкай формы, яе арганізуючая сіла, мастацкі закон, што выяўляецца ў адборы і спалучэнні стылёвых элементаў, спосаб выяўлення вобразнага адлюстравання жыцця, мастацкі прынцып адлюстравання чалавека, агульны прынцып арганізацыі мастацкай формы, прынцыпы, на аснове якіх ствараецца адзінства мастацкай формы. Г. Паспелаў называў стылем «пэўныя тыпы арганізацыі мастацкай формы, якія заканамерна вынікаюць з пэўных агульных заканамернасцей ідэйнага зместу» (Поспелов 1983, 201). Апошняя з прыведзеных дэфініцый стылю, на наш погляд, найбольш універсальная і пераканальная, паколькі яна заснавана на разуменні арганічнай сувязі зместу і формы ў літаратурным творы.

Стылёвыя асаблівасці беларускай літаратуры не ў апошнюю чаргу абумоўлены яе агульнай ідэйна-мастацкай накіраванасцю. Беларуская проза ад самага пачатку свайго развіцця і да нашых дзён выконвае не толькі чалавеказнаўчую, але і народазнаўчую функцыю. Вялікае месца ў беларускай прозе належыць апісальна-побытавай плыні, аднак наяўнасць апісанняў быту, у тым ліку народнага, хаця і выступав ў пэўнай ступені рысай нацыянальнага стылю, не заўсёды з'яўляецца паказчыкам індывідуальна-аўтарскага стылю.

Новая беларуская проза нарадзілася на хвалі адраджэння. Спалучэнне ў ёй мастацкага і этнаграфічнага дыскурсу ў пачатку мінулага стагоддзя - з'ява далека не выпадковая, бо айчынная літаратура сцвярджала саматоеснасць беларусаў і да таго ж, як адзначаў Л. Гаранін, пісьменнікі даволі часта «пачыналі нібы на пустым месцы, не з літаратурных традыцый, а з умоў самога жыцця, з фальклору, этнічных поглядаў і ўяўленняў, з паэтызацыі і лірызацыі побыту, звычаяў, умоў сялянскага жыцця» (Гаранін 1999, 33). Маладая беларуская проза, выпрацоўваючы стыль, нярэдка звярталася да таго, што называюць

«традыцыйнай этналагічнай спадчынай (міфы, легенды, казкі)» (Эко 1998, 404), а таксама да разгорнутых этнаграфічна-побытавых замалёвак. Адметнасць пісьменніцкага почырку ўжо на пачатковым этапе выяўлялася праз асаблівасці падачы этнаэстэтычных кампанентаў у структуры твораў: праз адлюстраванне паўсядзённасці, старажытных фактаў, апісанні звычаяў, нораваў, трансфармацыю фалькпорных матываў.

Некаторыя празаічныя творы па форме нагадвалі мастацка-этнаграфічныя -нарысы. З поўным правам да гэтага жанру паводле іх паэтыкі можна аднесці «Мікітавы хаўтуры», «Піліпава вяселле», «Дзяды» Аляксандра Пшчолкі, «Наша сяло, людзі і што робіцца ў сяле» Якуба Коласа, «Лісты з дарогі», «Думкі з падарожы», «Лісты кутніка» Ядвігіна LU., «Яшчэ раз аб перажытках паганства ў беларусаў» Каруся Каганца. Індывідуальнасць кожнага аўтара ў іх вымалёўвалася праз выбар прадмета адлюстравання: Ядвігіна LU. цікавіла сучаснасць, Каганца - рамантызаванае, Пшчолку - эстэтычна зніжанае, і абоіх (Каганца і Пшчолку) - рэха вечнага ў сучаснасці.

Ядвігін Ш. у сваёй «малой» прозе даволі актыўна звяртаўся да сюжэтных матываў народных казак і анекдотаў. Для яго важным было спалучэнне мясцовага (у перспектыве нацыянальнага) з агульначалавечым праз іншасказальнасць, уласцівую паэтыцы казкі І прытчы. Пісьменнік не пакінуў дэталёвых апісанняў народнага быту, ён не імкнуўся да яго ўзнёслай паэтызацыі, наадварот, у прозе Ядвігіна Ш. нярэдка сустракаецца развянчанне заскарузлай патрыярхальшчыны. Так, у апавяданні «Гаротная» аўтар расказвае пра лёс няшчаснай Тамашыхі, якая ўласнымі рукамі загубіла сваё апошняе дзіцяі, намагаючыся выратаваць сына-сухотніка, абкурыўшы яго, як ёй раіла знахарка, зёлкамі. Ядвігін ШЛ творча дапаўняў матывы народных казак і анекдотаў кароткімі побытавымі дэталямі, тым самым набліжаючы змест твора да сучаснасці. Так, у апавяданні «Падласенькіл, дзе казачная метамарфоза служыла сродкам выяўлення актуальней грамадскай праблематыкі, Падласенькі, што ператварыўся ў свінню, а не стаў, як хацелі бацькі, «чалавекам» (важнай і паважанай асобай), сімвалізуе адначасова тып недавучкі і тып чалавека, які грэбліва ставіцца да роднага, нацыянальнага.

Я. Колас таксама, як і Ядвігін UJ., належаў да тых пісьменнікаў, на якіх уплывал! імпульсы глыбінных пластоў народнай культуры. Яго ранняя проза даво|іі часта абапіралася на матывы народных казак і жартаў, аднак падзейная канва ў ёй больш шырока дапаўнялася этнаграфічна-бытавымі дэталямі ў аўтарскім асэнсаванні. Ілюстрацыйную ролю мастацкі этнаграфізм выконваў толькі ў зам£лёўках з «Другога чытання для дзяцей беларусаў» («Летняя раніца ў вёсцы», «Восень», «Зіма ў вёсцы», «Куцця» і інш.), у астатніх жа творах ён быў падключаны да сюжэту. У прозе Я. Коласа, як і іншых аўтараў пачатку XX ст., мастацкі этнаграфізм, як правіла, не меў канкрэтнай жанравай замацаванасці, служыў сродкам рэалістычнага паказу жыцця, а таксама выкарыстоўваўся для высмейвання забабонаў («Чорт», «Трывога», «Кажух старога Анісіма», «Дзяліцьба», «Хатка над балотцам», «У палескай глушы», «У глыбі Палесся»), Я. Колас першым у беларускай прозе прапанаваў і па-мастацку абгрунтаваў мадэль даследавання нацыянальнага характару праз схему «быт - быццё». «Асэнсаванне... сувязі паміж бытам і быццём у літаратуры - задача досыць складаная, няпростая, але разам з тым удзячная. На перакрыжаванні гэтых велічынь адкрываецца магчымасць многае зразумець і праясніць у літаратурнай тэорыі і мастацкай практыцы. Тут знаходзяць адбітак глыбінныя законы, якія адлюстроўваюць ступень падрыхтаванасці пісьменніка суадносіць прыватнае і агульнае, вывяраць будзённае і прыватнае ў жыцці высокаю мераю грамадскіх і агульначалавечых каштоўнасцей» (Жураўлёў 2004, 24). Матэрыялам для адлюстравання ў Я. Коласа выступала часцей за ўсё вясковае жыццё, дзе быццё, сапраўды, вырастав з быту. Менавіта такая - праз этнаграфічна-бытавы кантэкст - лінія даследавання рэчаіснасці І нацыянальнага характару набыла статус устойлівай традыцыі ў айчыннай прозе XX ст.

Асэнсаванне быцця праз быт стала свайго роду візітнай карткай беларускай прозы гэтага перыяду. Але не ўсе пісьменнікі прытрымліваліся такога пункту гледжання. Словамі галоўнага героя рамана «Рэвізія» сучасны пісьменнік Андрэй Федарэнка даволі рэзка адазваўся аб шырока існуючай эпігонскай плыні, за-

снаванай на эксплуатацыі этнаграфічна-бытавога матэрыялу: «...Уся гэта голая фактабіяграфічнасць, мянушкавая абазначанасць, літаратурная фактаграфія, фальклорна-этнаграфічна-лубковая натура даўным-даўно пераўтворана ў сумную самамэту, таму і адважвае запамінаць, выкарыстоўваць, ужываць - злуючы і раздражняючы, з аднаго боку, а з другога - закалыхваючы, падманваючы, прымушаючы забыць, што самая незвычайная тапаграфічная назва, любая іншая самабытная рэдкасць - нічога не вартыя самі па сабе» (Федарэнка 2004, 39-40).

З творчасцю Максіма Гарэцкага таксама звязана нараджэнне канкрэтнага стылёвага кірунку ў беларускай літаратуры. Мастацкі этнаграфізм у прозе Гарэцкага ярка выяўляў індывідуальнасць аўтара. Адной з цэнтральных тэм творчасці празаіка стала асэнсаванне генезісу і «перспектыў» нацыянальнага характару. Асаблівасць літаратурнай дзейнасці Гарэцкага заключалася, як справядліва заўважыў В. Каваленка, у пошуках занядбаных феноменаў нацыянальнага духоўнага жыцця. Схема Я. Коласа «быт - быццё» набывала ў Гарэцкага канкрэтна-часавае ўвасабленне. М. Бахцін справядліва заўважаў адносна асаблівасцей мастакоўскага бачання і адлюстравання свету: «Магчыма не толькі разумение адзінай і непаўторнай заканамернасці, індывідуальнасці, але магчыма і індывідуальная каузальнасць» (Бахтин 1979, 350). Этнаграфічнае для Гарэцкага - не дэкор, тым больш не экзотыка, а прыдатны сродак нацыянальнай, сацыяльнай і маральнай характарыстыкі персанажаў і перадачы паліфанічнасці рэчаіснасці. Прыклады філасофскага абагульнення малюнкаў паўсядзённасці і матываў народных паданняў мы знаходзім у ранніх апавяданнях Гарэцкага, а потым, у канцы жыццёвага шляху, у «Скарбах жыцця», дзе фальклорна-міфалагічныя матывы і этнаграфічна-бытавыя малюнкі набылі іншасказальна-абагульняючы характар. Наватарскім творам стала яго «Камароўская хроніка», у якой падзеі вялікай гісторыі можна было прасачыць праз сямейную генеалогію і танаталогію. Пісьменнік пазначыў і яшчэ адну перспектыўную ў творчым плане тэндэнцыю ў спасціжэнні рэчаіснасці: травесціраванне этнаграфічна-бытавых малюнкаў. Паказальная ў гэтым плане яго аповесць «Ціхая плынь». Да практычнага ўвасаблення літаратурных адкрыццяў Гарэцкага беларуская проза змагла наблізіцца толькі ў канцы XX - пачатку XXI ст. Прыкладам гэтага з'яўляюцца раманы «Карона Вялікага княства» Уладзіміра Бутрамеева і «Рэвізія» А. Федарэнкі, дзе этнаграфічна-бытавы кантэкст не толькі прадстаўляе нацыянальную рэчаіснасць, але і развенчвае існаваўшыя да таго часу літаратурныя клішэ.

Стылеўтваральную функцыю выконваў мастацкі этнаграфізм у творах такіх аўтараў 1920-х гг., як Васіль Каваль, Лукаш Калюга, Кузьма Чорны. В. Каваль - прадстаўнік лірыка-рамантычнай плыні ў беларускай прозе таго часу. Фальклорна-этнаграфічныя дэталі адыгрывалі важную ролю ў паэтыцы В. Каваля. Яго першы зборнік «Як вясну гукалі» атрымаў назву па аднайменнаму апавяданню, у якім абрад гукання вясны асацыіраваўся з чаканнем шчасця. Проза В. Каваля была пераважна апісальнай, яна знаёміла чытачоў з тагачаснай вёскай, са спецыфікай сялянскага жыцця на пераломе дзвюх эпох. Пісьменнік паказаў як стары вясковы ўкпад паступова набывае новыя рысы. У прозе В. Каваля падрабязнасці побыту (апісанне ўмоў жыцця, вопраткі, звычаяў) стваралі аб'ектыўную карціну вясковай рэчаіснасці.

У творах 1920-х гг. Л. Калюгі (апавяданнях, аповесцях «Ні госць ні гаспадар», «Нядоля Заблоцкіх») дасціпна высмейваліся забабоны, сляпая вера ў чужы вопыт, заганы старога патрыярхальнага і новага савецкага быту. Празаічныя творы 1930-х гг. («Пустадомкі», «Зоры Вам вядомага горада»), наадварот, паэтызавалі свет народных уяўленняў, народную мудрасць. Этнаграфічнае ў іх прадставала як нацыянальнае.

Філасофскім асэнсаваннем быту I быцця беларуса была прасякнута творчасць К. Чорнага, асабліва ў 1920-я гг. і ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны. Бытавыя малюнкі і з'явы сімвалізаваліся пісьменнікам. Для К. Чорнага нацыянальны быт - натуральнае асяроддзе чалавечага існавання і багатае поле для праяўлення характараў: нацыянальны свет меў канкрэтную геаграфічную лакалізацыю; мясцовае, знаёмае з дзяцінства, станавілася правобразам нацыянальнага свету. Напрыклад, у рамане «Сястра» быт 1920-х гг., гарадскі і вясковы, дазваляў пераканаўча намаляваць гістарычны «партрэт» часу. Этнаграфічны

матэрыял для пісьменніка не з'яўляецца самакаштоўнай фактурай, ён заўсёды мае сацыяльны ці філасофскі падтэкст. Так, у рамане «Трэцяе пакаленне» бытавыя пласты сацыяльна і па-філасофску сімвалізаваны, у рамане «Пошукі будучыні», напрыкпад, звесткі пра людзей, што жывуць на Вялікім Скрыжаванні, маюць інтэгральны характар, бо праз іх падаецца м/н/гісторыя і м/'н/'геаграфія беларускай зямлі. Пейзаж, паўсядзённасць, узаемаадносіны людзей - гэта для пісьменніка важныя элементы характарыстыкі асобы і народа. К. Чорны пры ўвядзенні ў твор этнаграфічнага матэрыялу аддаваў перавагу аўтарскім апісанням, а этнаэстэтычны кантэкст у яго найперш характарызаваў час і асобу.

Уладзімір Караткевіч паспрабаваў рэфармаваць беларускую прозу ў плане тэматычна-змястоўным, яго ўвагу прыцягвала гісторыя Бацькаўшчыны. Стылю пісьменніка ўласціва шырокае і па-мастацку абгрунтаванае выкарыстанне этнаграфічнага матэрыялу. Праўдзівае адлюстраванне мінулага патрабавала ад пісьменніка ўважпівага стаўлення да дэталей матэрыяльнага і духоўнага жыцця людзей пэўнага гістарычнага перыяду. Творы Караткевіча, асабліва раман «Каласы пад сярпом тваім», з поўным правам можна лічыць мастацкай энцыклапедыяй жыцця нашых продкаў. Мастацкай у тым плане, што факты ў ім асэнсоўваюцца тут з пазіцый не строгага гісторыка, а найперш мастака-творцы.

У сучаснай прозе традыцыі пісьменніка плённа працягваюць Вольга Іпатава, у творах якой этнаграфічна-бытавы кантэкст не толькі рэпрэзентуе час, але І стварае эмацыянальны фон, патрыятычны пафас аповеду, і Людміла Рублеўская, якая не злоўжывае этнаграфічна-бытавымі падрабязнасцямі, а падае толькі найбольш яркія дэталі і, як правіла, з пэўнай доляй добразычлівай іроніі.

Наватарскім падыходам да выкарыстання этнаграфічна-бытавых пластоў у мастацкім творы вызначаецца «Палеская хроніка» Івана Мележа. Пісьменніка захапляла не экзотыка жыцця «людзей на балоце» ў скпаданых жыццёвых абставінах, а чалавечыя лёсы і характары. Прысвячэнне «Бацьку, маці, бацькоўскай зямлі» да першага рамана «Людзі на балоце» выступав ў якасці эксплікацыі канцэптуальнага зместу твора і перадумоўлівае шырокае выкарыстанне звестак пра быт і звычаі палешукоў. М. Стральцоў справядліва заўважыў: «Спроба самога Мележа ў эпічным жанры здавалася рызыкоўнай і запозненай якраз ці не з прычыны ўсё той жа "перыферыйнасці", лакальнасці самога матэрыялу ("Людзі на балоце"), але ці не гэтая перыферыйнасць І выратавала справу, апраўдала ягоную спробу?» (Стральцоў 1986, 28). У першым рамане «Палескай хронікі» пісьменнік даволі падрабязна паказаў умовы жыцця палешукоў, склад іх мыслення, звычаі. Мясцовае адлюстроўвалася аўтарам на фоне агульнанацыянальнага і агульначалавечага. Рэгіянальны палескі каларыт не засланяў герояў, праблематыку твора, не абцяжарваў сюжэт. Па словах Стральцова, гэты раман Мележа «матэрыялам сваім і характарам "счаплення" гэтага матэрыялу» належыць «да класічнай раманнай схемы, што трымаецца на раўнавазе псіхалогіі І быту, лакалізаваных яшчэ і этнаграфічна» (Стральцоў 1986, 153). Празаік удала спалучаў мастацкі этнаграфізм суб'ектывізаванага і аб'ектывізаванага тыпу, гэта значыць, пісьменнік уводзіў этнаграфічны матэрыял праз аўтарскія апісанні і праз светаўспрыманне герояў - ён прысутнічае ў сюжэце і мове твора.

Падыход Мележа да паказу агульнанацыянальнага праз мясцовае атрымаў творчы працяг у прозе Вячаслава Адамчыка. Адамчык прыйшоў у беларускую прозу з акрэсленай тэмай: аб'ектам яго мастацкага даследавання стаў нацыянальны характар жыхара Заходняй Беларусі. Вернасць абранаму шляху Адамчык захоўваў на працягу ўсяго свайго творчага жыцця, працягваючы традыцыі Я. Коласа - прытрымліваючыся схемы «быт - быццё», і Мележа ў адпаведнасці з яго схемамі «рэгіянальнае - агульнанацыянальнае», «этнаграфічна-бытавое + псіхалагічнае і сацыяльнае». Спачатку гэта было суб'ектывізаванае падключэнне этнаграфічнага матэрыялу (апавяданні «Песня», «Жывая вада»), а потым - аб'ектывізаванае яго ўвядзенне (апавяданні другой паловы 1960-1970-х гг. і апошніх год жыцця, тэтралогія).

Паэтыка мележаўскай «Палескай хронікі» аказала ўплыў на творчасць Генрыха Далідовіча і Георгія Марчука, але арыгінальнага павароту ў асэнсаванні этнаграфічна-бытавых пластоў у названых аўтараў яна не нарадзіла.

Мастацкі этнаграфізм - яркая прыкмета прозы Анатоля Казлова, які аддае перавагу не столькі адлюстраванню элементаў матэрыяльнай культуры беларусаў, колькі цытацыі і інтэрпрэтацыі вуснай народнай творчасці. Таямнічы свет народных уяўленняў - гэта прыдатны для аўтара матэрыял, каб спасцігнуць духоўныя магчымасці чалавека ўвогуле і ў наш час у прыватнасці. Услед за Янам Баршчэўскім і Максімам Гарэцкім пісьменнік сцвярджае наяўнасць пэўнай логікі ў ірацыянальным. Этнаграфічны матэрыял у Казлова ўключаны ў сюжэт, «працуе» на раскрыццё маральна-этычнай праблематыкі, на характарыстыку персанажаў, пастаўленых ва ўмовы выбару паміж дабром і злом. У прозе пісьменніка пераважае суб'ектывізаваны тып увядзення этнаэстэтычнага кантэксту, яго герой прадстае захавальнікам нацыянальнага генатыпу, звяном у неперарыўным ланцугу пакаленняў чалавечага роду. На жаль, ён не заўсёды ў выкарыстанні мастацкага этнаграфізму прытрымліваецца пачуцця меры. У асобных творах («Мацвеева лазня», «Зацвітанне дзівасілу», «Раздарожаны саракоўнік», «Юргон») празмернае выкарыстанне фалькпорна-этнаграфічных падрабязнасцей прыводзіць да адваротнага эфекту. Тым не менш, абраная Казловым лінія адлюстравання жыцця надае яго творам непаўторнае гучанне.

А. Сакалоў пісаў: «Стыль як мастацкая заканамернасць знаходзіць выяўленне ў розных элементах структуры мастацкага твора. Элементы структуры твора выяўляюць заканамернасць стылю І становяцца яго носьбітамі» (Соколов 1968, 68). Паколькі прыгожае пісьменства - гэта чалавеказнаўства і народазнаўства, то мастацкі этнаграфізм патэнцыяльна ўласцівы любому літаратурнаму твору, аднак стылеўтваральным фактарам ён становіцца толькі тады, калі сістэмна паўтараецца ў творах пісьменніка і падкрэслівае спецыфічна-аўтарскае бачанне свету.

Л ІТАРАТУРА

Бахтин М.М. Эстетика словесного творчества. М., 1979.
Гаранін Л.Я. Проза // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: У 4 т. Мн., 1999. Т. 1.
Жураўлёў В.П. Якуб Колас І паэтыка беларускага рамана. 2-е выд., выпр. І дап. Мн., 2004.
Поспелов Г.Н. Вопросы методологии и поэтики. М., 1983.
Соколов А.Н. Вопросы теории стиля. М., 1968.
Стральцоў М. Пячатка майстра. Мн., 1986.
Федарэнка А. Рэвізія: Раман // Полымя. 2004. № 2.
Хейзинга Й. Homo ludens. В тени завтрашнего дня. М., 1992.
Э ко У. Отсутствующая структура. Введение в семиологию. СПб., 1998.

Паступіў у рэдакцыю 23.02.05.

*Ванда Юльянаўна Бароўка* - кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай літаратуры Віцебскага дзяржаўнага універсітэта імя П.М. Машэрава.

*А.П. БЯЗЛЕПКІНА*

## ФОРМЫ БЕЛАРУСКАГА ЛІТАРАТУРНАГА РУХУ XX ст.: ПЫТАННЕ ТЭРМІНАЛОГІІ

Сравнивается белорусская, русская и польская терминология для описания форм литературного движения, таких как группировка, группа, объединение, организация. На многочисленных примерах показываются специфические особенности белорусской терминологии в этой области. Предлагается вариант унификации терминологии.

Belarusian, Russian and Polish terminology concerning the description of all forms of literary movement such as group, association, society, organization, etc. is being compared. The numerous examples show specific peculiarities of the Belarusian terminology in this sphere. A variant for the unification has been proposed.

У беларускім літаратурным руху XX ст. вылучаюцца нешматлікія, але разнастайныя формаўтварэнні, якія вызначаюцца як суполкі, арганізацыі, аб'яднанні, асацыяцыі, таварыствы, саюзы, што патрабуе больш дакладнай тэрміналагічнай дыферэнцыяцыі ў пазначэннях форм літаратурнага руху. Праблема надання дэфініцый ускладняецца яшчэ і тым, што многія з іх маюць назвы з трывалай гісторыяй ужывання.

У беларускім акадэмічным літаратуразнаўстве (Гісторыя 1999) формы літаратурнага руху акрэсліваюцца на першы погляд непаслядоўна: напрыкпад, «Маладняк» называецца і аб'яднаннем (Усебеларуская канферэнцыя літаратур-